Здароўя і жалезны пэндзаль Ларыёнаву!

У мінулую нядзелю ў галерэі «Тызенгаўз» адбылася «імянінная» выстава Аляксандра Ларыёнава пад назвай «Аз».

Спадар Ларыёнаў вядомы перш за ўсё як гаспадар прыватнай галерэі, якая працуе Ў Гродне ўжо чацвёрты год. Выставаў новых карцін гэтага мастака шырокая грамадскасць не бачыла ўжо даўно. Таму нядзельная імпрэза выклікала надзвычайны інтарэс публікі.

У экспазіцыю ўвайшлі некалькі серый карцін, зробленых у розны час на працягу 15 гадоў. Сярод іх - цыклы «Чорныя дошкі», «Пагарэльшчына», «Алфавіт» ды іншыя. Частка з іх знаёмая гарадзенцам па выставах у Музеі гісторыі рэлігіі і Выставачнай зале. Новая выстава характэрная досыць высокай канцэнтрацыяй філасофскага гучання. Невялікая, камерная галерэя «Тызенгаўз» змясціла амаль паўсотні твораў, кожны з якіх нясе сваю моцную энергетыку, спрачаецца за гаспадарства ў зале. З гэтай нагоды спадар Церабун, вядомы гарадзенскі мастак і скульптар, заўважыў: «Сённяшняя выстава -вельмі высокай філасофсскай якасці. Гэтыя творы трэба не толькі разглядаць - іх трэба вывучаць».

На выставу прыйшлі амаль усе «вяршкі» гарадзенскай грамадскасці. Сябры віншавалі вельмі цёпла і шчыра. Творы Аляксандра Ларыёнава вызначаюцца выяўленнем вялікай лучнасці чалавека і прыроды, амаль біблейскімі, архаічнымі перапляценнямі вобразаў людзей з першаснавамі жыцця: зямлёй, міфічнымі жывёльнымі істотамі, прыроднымі стыхіямі. Кожная былінка ці яшчарка на карціне асветлена жывым духам. Сябра і калега майстра Антон Ляшчынскі назваў мастацтва Ларыёнава «адначасова духоўна-канцэптуальным і наіўным». Наіўным у тым сэнсе, што мастак здолеў захаваць дзіцячую жывасць успрымання, здольнасць дзівіцца звычайнаму і «бачыць, як наліваецца сокам трава».

Згодна з аўтарскай задумай, выстава «Аз» - гэта «чыстая духоўнасць, гэта - я. Сапраўдная форма знаходжання мастака ў свеце -адзінота, схаванасць ад лішніх людзей. Надыходзіць дзень, і ты разумееш, што на самой справе ты - сам-насам са сваім «Я», што ты размаўляеш з самім сабой. Толькі тады нараджаецца

У дзень свайго вернісажу Аляксандр літаральна патанаў у кветках

мастак».

Сапраўдны творца заўсёды адзін і не адзін. Ён - у кожнай малекуле сусвету, ён распыляе часткі сваёй душы на ўсё жывое. Таму слушна заўважыла знакамітая акторка аблдрамтэатра Алена Гайдуліс: «мастацтва Ларыёнава - гэта боль і любоў да жывога, да жыцця, да душы».

Аднак сярод бясконцых віншаванняў і кветак, напэўна, самым карысным падарункам быў сюрпрыз майстра мастацкага кавальства Алеся Мацко. Ён прэзентаваў «вечны пэндзаль» аўтарскага выканання - металічны сувенір у выглядзе сапраўднага пэндзля.

За 15 год творчай дзейнасці Аляксандр Ларыёнаў правёў каля дзвюх дзесяткаў персанальных выставаў, самыя гучныя з якіх - у Маскве, Нью-Ёрку, Мемфісе, Познані. Нядзельная імпрэза ў «Тызенгаўзе» атрымалася напалову вернісажам, напалову - імянінамі. Ларыёнаў ізноў пацвердзіў тэорыю, што « ў мастакоў усё не як у людзей». Так, ва ўсіх людзей дзень нараджэння бывае толькі раз у год. А ў некаторых мастакоў - двойчы, а то і болей. Прыкладна так і ў нашым выпадку: Аляксандр Мікалаевіч прымае віншаванні ад розных людзей у розных месцах прыкладна ад пачатку восені. Яшчэ абяцаў віншаваць калектыў выкладчыкаў з ГрДзУ, дзе ён чытае курс лекцый па культуралогіі. Так і павінна быць - на дзень нараджэння не запрашаюць. Але той, хто прыходзіць сам - сапраўдны сябар.

Алена Сіневіч